

Магілеўскі
ВЫБАР
№ 12 (50)
Чэрвень
2015 г.

Абласная Дэмакратычная Трыбуна

Над Быховом безоблачное небо

Самый большой в Могилевской области район – Быховский, погружен в апатию. Возможно, это результат воздействия жаркой погоды, радостной для купальщиков, но сжигающей посевы на и так бедных почвах района. А, возможно, людям надоели постоянные кадровые пертурбации в районе, набившие оскомину всей области. Впрочем, заинтересованные лица обсуждают вероятность смены руководства в местной провластной газете «Маяк приднепровья», но и гадают – чем же редактор не угодил… Критика состояния дел в районе отсутствует, главной персоне уделяется достойное внимание, перспективы очерчены достойно. А что жители микрорайона Колос недовольны отсутствием горячей воды или протесты владельцев гаражей кооператива «Альбатрос» по факту отключения электроэнергии за отказ убирать территорию, так это, скорее, очень мелкие недоработки властей на фоне будущих успехов.

На самом деле Быховский район один из самых проблемных в области, которые с течением времени только нарастают. Особенно удручает ситуация с населением – ежегодно район по разным причинам «теряет» по 700 человек – это весьма негативный индикатор социально-экономической политики местного руководства.

Провалы в экономике района областное начальство периодически лечит засылаемыми на и так пострадавшую территорию от аварии на ЧАЭС временными управленцами-варягами из других, таких же безуспешных, регионов. Результат их работы прогнозируем, перспектива ясной кажется только в материалах местной районной газеты. В подтверждение – итоги работы Быховского района за прошлый год. Собственно, звезд район не хватал и ранее, но 2014 год стал для него особенно провальным



в аграрном секторе экономики. Всего 90,4% при задании 105,4 составил основной прогнозный показатель по темпу роста валовой продукции во всех категориях хозяйств, а в сельхозорганизациях и того меньше – 90,1%. Из 11 сельхозорганизаций 4 (СПК «Володарский», «Следюки», ОАО «Быховрайагрпромтехснаб», филиал «Мокрянский» ОАО «Быховский консервно-овощесушильный завод») не достигли уровня прошлого года. А вот задание по темпу роста валовой продукции выполнили только 2 – СЗАО «Агролинк» и филиал СК «Дуброва» ОАО «Могилевлифтмаш». Недобор продукции по району в стоимостном выражении (почувствуйте масштабы!) составил 61,8 млрд. рублей.

По итогам работы за 2014 год Быховский район по удою молока на корову занял в республике 94 место, «сминусовав» к уровню предыдущего года 504 кг, валовое производство молока снизилось на 15%, производство скота и птицы снизилось на 21,7%, среднесуточные привесы крупного рогатого скота – на 147 граммов, свинину район вообще прекратил производить. Если прежнее руководство поставило крест на свиноводстве в районе, нынешнее не менее успешно игнорирует указание облисполкома по восстановлению свинопоголовья. Но и численность крупного рогатого скота не прирастает – в прошлом году общественное стадо уменьшилось на 1747 голов.

Не лучше в производстве молока обстоят дела и в году нынешнем – молоко район плюсует в пределах 10-15%. Цепляться за прошлогодний уровень – весьма неперспективная задача: район должен ежедневно добавлять по 40-45% производство молока, чтобы выйти на рентабельное его производство. В 2015 году продолжается в целом падение производства в сельском хозяйстве – за 1 квартал на 1263 головы снизилось количество крупного рогатого скота, продукция выращивания составила лишь 69,9% к уровню 2014 г. Устойчиво убыточными в текущем году являются 3 хозяйства района: СПК «Быховский», «Следюки», филиал «Мокрянский ОАО «Быховский КОСЗ».

В целом за первый квартал аграрники получили прибыли 2,4 млрд. руб – 38,7% к уровню прошлого года. При этом рентабельность реализованной продукции составила 3,2%, рентабельность продаж – 2,8% при

задании 3,0. Конечный финансовый результат – 22,4 млрд. убытков.

Сейчас в день производство молока составляет свыше 135 тонн – это крайне недостаточно для вывода отрасли в «плюс», но и рекомендации от председателя райисполкома (очередного) организации во всех хозяйствах трехразовой дойки коров граничат с дилетантством – надой молока от количества доек не зависит. Да, 10% можно найти таким образом, но потери будут гораздо печальней. Не лучше ли заняться действиями системного порядка: воспроизводство стада, кормовая база, стимулирование труда. Элементарные вещи организационного порядка не реализуются быховскими аграриями: нарушены сроки сева практически всех культур, в том числе и кукурузы («Мокрянский», «Обидовичи»), в хозяйствах отсутствуют современные пастбища, подкашивание имеющихся пастбищ не налажено, игнорируется фронтальная пастьба коров.

Есть и хорошее в сельском хозяйстве района: председатель облисполкома В.Доманевский и вице-премьер страны М.Русый дали положительную оценку строительства новой молочно-товарной фермы в СПК «Обидовичи» и, даже, пообещали помочь финансово. Но, если говорить честно, высокие представители власти больше ругали местное руководство, чем раздавали награды. Ведь в районе в государственную программу финансирования вошли только две фермы – кроме вышеозначенной еще и ферма филиала «Мокрянский». А другие строящиеся фермы? Не вошли по одной причине – там фактически ничего не сделано. Таким образом Быховский район лишился миллиардов рублей инвестиций, но и возможности в короткое время создать современные условия для развития молочного животноводства. А если учесть, что в 2014 году инвестиции в основной капитал за счет всех источников финансирования составили только 65,4% к уровню 2013 года, можно спрогнозировать затянувшееся пике района в производственно-финансовую пропасть. Кстати, показатели, являющиеся условием для оказания государственной поддержки, не выполнила ни одна сельскохозяйственная организация, получавшая ее в прошлом году.

На 1 января 2015 г. дебиторская задолженность по сельхозорганизациям составила 21,3, а кредиторская – 234,7 млн. рублей или в 11 раз больше! Кроме того, задолженность сельхозорганизаций по бюджетным ссудам составляет 63 млрд. рублей. Фактически Быховский район является банкротом и при нынешней системе организации экономики района перспектив у него нет.

Считается, что промышленность Быховского района в прошлом году сработала нормально – промышленные предприятия за год «приросли» валовой продукцией на 21,4%, а индекс производства промышленной продукции по товарам-представителям сложился на уровне 103,8% при среднеобластном показателе 92,5%. Запасы готовой продукции сократились на 41,5%, причем, 88% от всех запасов принадлежит ОАО «Быховский консервно-овощесушильный завод».

На самом деле, промышленность района лишь наверстывает провалы в производстве, допущенные в 2012, 2013 гг. Да и результаты производства валовой продукции первого квартала 2015 г. не радуют – лишь 96,8% к уровню прошлого года. Так что главные сюрпризы от промышленников еще впереди.

Бюджет района за 2015 г. исполнен с дефицитом в 50 млрд. рублей – это феноменальный случай для области, когда рядовой район «высасывает» из государства такие деньги. Изменится ли что к лучшему с приходом нового председателя райисполкома? Как говорится, поживем – увидим. Только вот по итогам 1 квартала 2015 г. дефицит бюджета уже составляет 23 млрд. рублей! Ком проблем у государства с Быховским районом продолжает нарастать, хотя внешне в районе тихо и спокойно..Над Быховом безоблачное небо...

Пётр МИГУРСКИЙ.

Заява Р.Кастусёва



Напярэдадні візіту ў Шклоў Аляксандра Лукашэнкі мясцовая міліцыя праследуе апазіцыю, сцвярджае экс-кандыдат у прэзідэнты, намеснік старшыні Партыі БНФ, жыхар райцэнтра Рыгор Кастусёў.

«У кватэру прыходзіў міліцыянт, сказаў, каб у бліжэйшую суботу да абеду не адчынялі вокны, а потым спытаў, дзе я знаходжуся, таму што яго прасілі ўдакладніць», **- паведаміў апазіцыйны палітык. Паводле яго слоў, у цяперашні час ён знаходзіцца ў сваёй вёсцы паблізу раённага цэнтра.**

«Я разглядаю такую зацікаўленасць напярэдадні прыезду Лукашэнкі як палітычны пераслед. Паколькі само пытанне ўжо гучыць непрыемна. Пытаюцца ў родных, блізкіх, каб паказаць - глядзіце, мы за вамі сочым. Гэта палітычны пераслед, намёк на нейкія магчымыя дзеянні», **- лічыць Кастусёў.**

Па словах апазіцыйнага палітыка, адна з мэтаў візіту Лукашэнкі - наведванне шклоўскага даўгабуда Лядовага палаца. ***«Яго павінны былі скончыць гады тры таму, але ніяк не дабудуюць. Нават моладзь у Шклове збірала подпісы, каб адбудавалі гэты Лядовы палац, адпраўлялі ў Адміністрацыю Прэзідэнта. Палац пачыналі дабудоўваць, потым зноў закідвалі. Кажуць, не хапае грошай, пры тым, што кожны год мы чытаем, што ў Шклове выкрываюцца факты карупцыі на сотні тысяч долараў»,*** **- сказаў намеснік старшыні Партыі БНФ.**

Паводле belapan.by



Круглянскія дзьмухаўцы

Круглае шпаркімі тэмпамі рыхтуецца да абласных "Дажынак – 2015". Для належнай арганізацыі гэтага знакавага мерапрыемства з усіх крыніц фінансавання плануецца выдаткаваць 53 млрд. руб. Грошы немалыя, але ж і фронт работ, развернуты па добраўпарадкаванню гарпасёлка, не маленькі. Мясцовым будаўнікам і камунальшчыкам прыйдзецца ў сціслы тэрмін правесці капрамонт сямі і бягучы рамонт фасадаў 12 шматкватэрных жылых дамоў, прывесці ў належны стан 34 дваравых тэрыторыі. Ужо зараз дарожнікі вядуць укладку асфальту па галоўнай вуліцы гарпасёлка. Нажаль, грошай хопіць толькі на стварэнне малюнку добраўпарадкавання у цэнтры пасёлка – ні ўскраінныя тэрыторыі, ні, тым больш, вёскі ад мерапрыемства ўшанавання перадавікоў бітвы за ўраджай нічога не паймеюць.

Ды што там вёскі – праблем у самім Круглым вельмі шмат, але яны з-за бяздзейнасці мясцовых улад прымаюць для мясцовых жыхароў глабальныя памеры. Напрыклад, колькі разоў уладальнікі жывёлы звярталіся ў райсавет за дапамогай у рамонце *"козьей кладки",* якая перакінута праз мясцовую рачулку і без якой немагчыма арганізаваць паўнавартасны выпас жывёлы. Ламае кладку крыгаход, мясцовыя пьяніцы, якія там часам наладжваюць гульбішчы, неадэкватная моладзь, нарэшце, рыбакі. Мясцовыя жыхары выходзілі з прапановай для ўлад зрабіць на суседніх астраўках месца для адпачынку, але і гэта не прайшло. Адзіны разумны савет ад улад – шукайце матэрыялы і рабіце самі. А што тут зробіш, калі гэтая кладка патрабуе не толькі грошай, але і інжынернай думкі з тэхнічным суправаджэннем.

Хтосьці можа сказаць, што гэта дробязь. Можа і так, але мясцовую ўладу характарызуе адпаведна. Ці возьмем іншы прыклад. У працэсе падрыхтоўкі да Дажынак мясцовыя чыноўнікі вырашылі, што шэраг гадамі апрацоўваемых пенсіянерамі агародаў можа непрыемна ўразіць высокіх гасцёў, якія тут і прабудуць цэлых паўдня. Падумалі, прынялі рашэнне і праз колькі часу пайшлі пад нож цяпліцы, кусты бэзу,жасміну, руж. А колькі людзі папрацавалі над агародамі, колькі ўклалі працы і сродкаў! А што зараз? Ды нічога пакуль, толькі гнеў людскі..

Няма грошай нават на рамонт каляпад'езднай тэрыторыі, дзе пажылыя людзі раз-пораз спатыкаюцца на выбоінах у бетоне і, нават, падаюць. Ды адкуль тут будуць грошы, калі даходная частка раённага бюджэту на 66% сфармавана за лік трансфертаў з вышэйстаячых бюджэтаў. Нават і гэта не дапамагло – 2014 год раён завершыў з дэфіцытам у 7,3 млрд. рублёў. Пры гэтым паступленні ад штрафаў склалі амаль 900 млн. рублёў. На 2015 год распрацаваны бездэфіцытны бюджэт, але цудоўным чынам доля налогавых даходаў скарацілася з 28,7% да 24,6%. Праўда, каб кампенсаваць сваю чыноўнічую нягеглась, сесія раённага Савета зацвердзіла аб'ём штрафаў з мясцовага насельніцтва і суб'ектаў гаспадарання у памеры 1 млрд. рублёў. Во, маштабы руплівасці чынавенства!

У той жа час, сельская гаспадарка па выніках 2014 г. спрацавала не на поўную моц – валавай прадукцыі дабавілі толькі 3,1%, вытворчасць мяса буйнарагатай жывёлы, навогул, зменшылі на 1%. Ды і ўраджайнасць зерневых не на вышыні – толькі 45,4 ц/га.

Але здзівілі вынікі працы прамыслоўцаў – толькі 84% ад узроўню 2014 года. Вось бы дзе накінуцца ўсёй уладай на праблемы і падняць раён! Праўда, трошкі дапамаглі раёну прадпрыймальнікі – яны за год павялічылі долю ў даходнай частцы аж на 4,3%, хаця колькасць камерцыйных арганізацый у раёне за год не змянілася.


Ёсць вельмі яскравы паказчык актыўнасці ўлады ў эканоміцы, які на адным з першых месцаў у Беларусі – гэта аб'ем прыцягнутых прамых замежных інвестыцый. Дык вось, у Круглянскі раён замежных інвестыцый "прыцягнулі" 3,4 тыс. долараў ЗША. Можа б у гэтым напрамку трохі папрацаваць, а не змагацца з пенсіянеркамі?

Дарога да Круглага з боку Магілёва выглядае вельмі прыстойна – трэба аддаць належнае ўсім адказным службам. Але ўражвае мноства дзьмухаўцоў як па абочынах, так і на палетках. А калі поле ў дзьмухаўцах, то добрага ўраджаю наўрад ці можна дачакацца. Многа гэтага расліннага шкодніка і ў горадзе – з такімі тэмпамі распаўсюду вельмі хутка раён можа пераўтварыцца ў запаведны край дзьмухаўцоў, якія запалоняць і без таго не так ужо і ўрадлівыя палеткі раёна.

Уражанні ад наведвання раёна не зусім прыемныя, асабліва пасля гутаркі з пажылымі людзьмі, на патрэбы якіх мясцовыя ўлады не звяртаюць увагі. А многія ж з іх прайшлі праз ліхалецце вайны, працавалі ўсё жыццё...

Але ж ёсць у Круглым месца, дзе кожны мясцовы жыхар і госці адпачываюць душой. Вельмі прыемна, што ўсе суразмоўцы адзначалі працу мясцовай бібліятэкі. Дабразычлівыя і пісьменныя супрацоўнікі, крэатыўныя падыходы да працы з наведвальнікамі, утульнасць і спакой – ці не тое гэта месца, дзе трэба не толькі набываць веды, але і вучыцца працаваць? Усім.

Пётр МІГУРСКІ.





В продолжение темы...

Козья кладка или Гомо-бюрократикус

Сейчас в интернете на сайтах российских и украинских газет нередко можно встретить спорные статьи о строительстве Керченского моста в Крым. Смешные люди! Тоже мне - нашли проблему! Спросили бы наших круглянских чиновников из райисполкома, которые уже почти десяток лет решают вопрос о строительстве козьей кладки через реку Друть, и всё бы давно решили. И бесплатно для госкармана. Как бесплатно для бюджета Круглянского района обходится мостик, по которому жители перегоняют на другую сторону Друти не только домашнюю живность – коз, но и, к тому же, жители микрорайона Слободка сокращают почти два километра дороги, добираясь домой из центра Круглого.

О сути вопроса. В ответе от 12.03.2015 года за № 10-Кол-01 Круглянского районного исполнительного комитета на наше обращение указано: *«Строительство (ремонт) перехода через реку предусматривает наличие проектно-сметной документации, источников финансирования на указанные цели и необходимость данного сооружения».* Вот усомнились они в необходимости данного мостика и считают прихотью желание некоторых пенсионеров держать в подсобном хозяйстве коз, которые пасутся на болотистом лугу за рекой! И при их зарплате, которую они получает на службе у народа, т.е. у нас с вами, в общем-то не важно, что наличие козьего молока повлияет не только на бюджет пенсионеров, но и на отсутствие у них, можно сказать, лечебного продукта питания, потому что само по себе козье молоко полезно, а тут ещё добавляется и то, что болотистый луг экологически чист, что не скажешь про другие места, где ещё разрешают пасти скотину. Луг с трёх сторон окружён руслом реки Друть, имеет площадь в несколько гектаров и на нём произрастают многие употребляемые козами лекарственные травы. Козье молоко очень полезно детям, даже грудным, и старикам, так как обладает эффективными качествами для улучшения пищеварения.

Но главное ещё не в этом! *«В связи с отсутствием в районе специализированной организации, выполняющей строительство и ремонт такого рода, отсутствием источников финансирования на указанные цели, выполнить ремонт перехода через реку не представляется возможным».* Вот на этом бы захотелось заострить внимание.

Уже не первый год районные чиновники отвечают как под копирку. За это время (а вопрос встаёт каждую весну) можно было бы не только найти источники финансирования, но заказать проект на строительство мостика. Даже можно было бы построить такой мостик, который бы украсил любимое место отдыха круглянцев.

Каждый год мы, старики, собираемся толокой и сами строим свою козью кладку, которой пользуются все отдыхающие у реки, рыбаки и жители Слободки. Каждый год половодье смывает часть мостка там, где течение более быстрое, и нам приходится искать материалы для ремонта. Суть ведь и заключалась в том, чтобы обсудить с руководством района, где мы можем приобрести за свои собранные с владельцев коз деньги на стройматериалы. Ну, некогда руководителям райисполкома встречаться с людьми! Видимо, заняты они важными государственными делами. И почему-то не обращают внимания на то, что вопрос поддержки подсобных хозяйств в Республике Беларусь поднят на самом высоком уровне Указом Президента. Вот и в ответе, который был дан Круглянским исполкомом на запрос Могилёвской общественной инициативы «Падворак», председателем которой я являюсь, написано: *«У адпаведнасці з Праграмай развіцця і падтрымкі асабістых падсобных гаспадарак грамадзян на 2012-1015 гады, зацверджанай рашэннем раённага Савета дэпутатаў ад 30 лістапада 2010 года № 9 – 1 у раёне праводзяцца мерапрыемствы па развіццю і падтрымцы асабістых падсобных гаспадарак грамадзян».* Особенно яркие чувства в ответе чиновников Круглого у меня вызывают строки, цитирую: *«У раёне вядзецца тлумачальная праца сярод насельніцтва аб неабходнасці развіцця асабістых падсобных гаспадарак грамадзян, па павелічэнню пагалоўя буйнай рагатай жывёлы, кароў, свіней, коней і павялічэнню пасяўных плошчаў».*

Из окон Круглянского «Дома Советов» наш козий лужок виден, как на ладони. А так как в ответе козы не упоминаются (хотя и нельзя отрицать, что их



наличие в подсобных хозяйствах населения в официальном документе может быть значится под «крупным рогатым скотом», ведь коровы там упомянуты отдельно), можно констатировать, что в последнее время количество коз у граждан увеличивается. Это говорит о том, что люди хотят пить натуральное молоко. И многим людям, особенно пожилым, не по силам содержать корову, поэтому и отдаётся предпочтение козам. Потому и хотелось бы на практике услышать, как проводится эта работа с населением. За двадцать лет, что я содержу подсобное хозяйство, я ни разу не присутствовала при такой работе. Не буду отрицать, уже два года мы не имеем проблем с сеном, благодаря лично председателю Круглянского райисполкома А.Шупленкову. Но на этом помощь и заканчивается. Потому что имеется очень много вопросов, которые мы не можем решить сами, а руководство района «сидит слишком высоко» и, видимо, с той высоты ему наши проблемы кажутся мелкими и ничего не значащимися.

Быть может, в Могилёвском облисполкоме, куда нам придётся обратиться, проявят больше внимания к проблемам круглянских пенсионеров и помогут и с мостиком через реку Друть, и со средствами на проектную документацию. Тем более, что в этом году ожидаются выборы Президента.

Подсобное хозяйство никогда не бывает убыточным. И если бы чиновники на самом деле уделяли должное внимание его развитию, жить нам было бы намного и сытнее, и самоудовлетворённее. Человеку свойственно гордиться своим трудом, видеть его результат и ощущать свою полезность. По силам. И пенсионеры стараются вложить свою лепту в положительное развитие государства. И нужно немногое – наладить «мостик» между народом и властью. А вот на это ума у некоторых чиновников и не хватает.

А жаль!

Зинаида МИЛЕЩЕНКО.

ЛОКШЫНА НА ВУШЫ ПА-ЧЭРЫКАЎСКІ

У маі гэтага года ў артыкуле «Без труб і барабанаў» (гл. «МВ» № 9) мы ўжо распавядалі аб тым, як за кошт вылучэння чарговай порцыі ільготных крэдытаў нібыта для ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі кіраўніцтва Беларусі фактычна разграбала складскія запасы прадукцыі на МТЗ і заганяла вяскоўцаў ва ўсё большую кабалу фінансавых запазычанасцяў. Прычым, рабілася гэта цішком, без гучнага асвятлення ў СМІ. Але жаданне выдаць жаданае за сапраўднае ў некаторых прапагандыстаў ад мясцовай улады ўсё-ткі выявілася.

Напрыканцы красавіка гэтага года на старонках чэрыкаўскай газеты «Веснік Чэрыкаўшчыны» з'явіўся артыкул пад гучнай назвай «У сельгаспрадпрыемствы прыбыла новая тэхніка». У ім распавядалася пра тое, што машынна-трактарны парк сельгасарганізацый Чэрыкаушчыны папоўніўся пяццю адзінкамі трактароў. Пры гэтым аўтар гэтай прапагандысцкай агіткі пераконвае чытачоў у тым, што ***«новая тэхніка айчыннай вытворчасці была набыта сельгаспрадпрыемствамі за ўласныя сродкі, у растэрміноўку».***

Аўтар артыкула і тыя, хто за ёй стаіць, мякка кажучы, вешаюць чытачам «локшыну на вушы». Так званых уласных сродкаў на набыццё новай тэхнікі ў сельгасарганізацыях Чэрыкаўскага раёна практычна няма. Гаспадаркі раёна, калі ўважліва чытаць у тым жа «Весніку Чэрыкаўшчыны» рэгулярныя паведамленні аб штотыднёвых апаратных планёрках ў райвыканкаме, з цяжкасцю знаходзяць сродкі для своечасовай выплаты заработнай платы. Фінансавыя абавязацельствы сельгасарганізацый Чэрыкаўшчыны па выніках працы за 2014 г. перавысілі 220 млрд. руб. З іх пратэрмінаваныя склалі амаль 3 млрд. руб. Тэмп росту фінансавых абавязацельстваў арганізацый АПК Чэрыкаўскага раёна апынуўся па выніках 2014 г. самым высокім сярод усіх раёнаў Магілёўскай вобласці і склаў 157% (па Магілёўскай вобласці - 100,2%, у цэлым па Беларусі - 107,1%).

Для пацверджання вышэйназваных довадаў прывядзем для нашых чытачоў інфармацыю з рэспубліканскіх дзяржаўных СМІ. Так, напрыклад, «Сельская газета» ад 21 мая ў артыкуле свайго карэспандэнта А. Шаўко «Разлічваць на пазыкі «пад склад» не трэба» піша: ***«У пачатку красавіка уведзены ў сілу Указ аб падтрымцы вытворцаў сельскагаспадарчай і іншай тэхнікі праз «Прамагралізінг» і Банк развіцця. Грузавікі, камбайны, трактары, станкі, абсталяванне прадстаўляюцца ў лізінг арганізацыям АПК пад 2%, для астатніх спажыўцоў - пад 9,5% на тэрмін да 8 гадоў з авансавым плацяжом 10-15%. Заяўкі падалі ўжо больш за 200 арганізацый на агульную суму каля 1 трыльёна рублёў».***

У гэтым жа сэнсе сцвярджэнне чэрыкаўскага прапагандыста ад журналістыкі абвяргае і артыкул карэспандэнта «Сельской газеты» В. Гедройца ў тым жа нумары пад назвай «Завезлі чужы трактар - свой застаўся на складзе». У ёй прама гаворыцца пра тое, што айчынная эканоміка (у тым ліку і сельская гаспадарка) знаходзіцца ў глыбокім крызісе, і ўласных сродкаў на набыццё новай тэхнікі і абсталявання папросту няма. Паводле афіцыйнай інфармацыі, атрыманай з дзяржаўных крыніц, на 1 лютага гэтага года запазычанасць па крэдытах і пазыках сельгасарганізацый Беларусі дасягнула 50 трлн. рублёў і вырасла на 18,8%. Сума чыстай страты дасягнула 1,4 трлн. рублёў і павялічылася ў 13 разоў у параўнанні з аналагічным перыядам 2014 г. На калегіі Міністэрства фінансаў у сакавіку гэтага года было заяўлена, што сельскагаспадарчыя прадпрыемствы рэспублікі не могуць самастойна разлічвацца з даўгамі і гасяць іх за кошт мясцовых бюджэтаў. Па ацэнцы Мінфіна, на 2015 год у мясцовых бюджэтах на гэтыя мэты закладзена 600 млрд. рублёў, а па факце выплаты могуць перавысіць 1,3 трлн. рублёў. ***«Час спыніць выбудоўваць даўгавыя піраміды, калі сельгасарганізацыі працягваюць назапашваць праблемную запазычанасць, а мясцовыя бюджэты пагаршаць і без таго крытычны ўзровень пазыковай ўстойлівасці»,*** - піша з гэтай нагоды часопіс «Фінансы і крэдыт».

Не будзем турбаваць нашых чытачоў новымі і гэтак відавочнымі фактамі крытычнага становішча ў аграрным сектары (і не толькі ў ім) Беларусі. Яны бачныя ўсім адэкватна думаючым грамадзянам, але толькі не прапагандыстам ад улады, у лік якіх запісалі сябе і вельмі многія з ліку нашых калегаў па журналісцкай дзейнасці з дзяржаўных СМІ.

Вадзім ЗАБРОДАЎ.

ФОК или кирпичный завод?

В ТОМ, ЧТО ПЛОХО - ВИНОВАТ ДЯДЯ

Недавно официальные белорусские СМИ познакомили своих читателей, зрителей и слушателей с итогами социально-экономического развития Беларуси в первом квартале 2015 года, которые подвели на заседании Совмина. Общая оценка звучит нерадостно. ВВП за первый квартал уменьшился более чем на 2%, почти на 30% упал экспорт и валютная выручка, чуть менее чем на 15% выросли складские запасы по сравнению с аналогичным периодом 2014 года. По итогам января-февраля убыточными признаны почти четверть предприятий организаций страны. С рентабельностью от 0 до 5% сработало 35,2% предприятий транспортной отрасли, 42% - строительной, 49% - промышленности, 71% - торговли. Инфляция за четыре месяца этого года составила 6%, рост кредитов - 14%. Широкая денежная масса увеличилась на 13,8%.

Ситуация, прямо скажем, аховая. В правительстве в очередной раз признали наличие проблемы низкой эффективности и недостатки в производственной и маркетинговой политике. *«В правительстве считают,* - написала «Сельская газета» от 21.05.2015 года, - *традиционные меры повышения эффективности экономики исчерпаны, и предлагают радикально снижать затраты, в том числе и административные».* Но при всём этом продолжают ссылаться на негативное влияние внешних факторов: падение цены на нефть, девальвация российского рубля, военные действия в соседней Украине, снижение спроса у основных торговых партнёров.

Признаёт наличие проблем в народнохозяйственном комплексе страны и А. Лукашенко. Но при этом продолжает твердить, что на макроэкономическом уровне ничего кардинально менять не надо. У нас всё хорошо продумано, а вот у них плохо, но страдаем от этого мы. Напомним нашим читателям, что после последней девальвации белорусского рубля причиной всех бед нашей экономики президент назвал ситуацию в России: *«Один этот рынок обвалился, - и мы следом полетели».* Спрашивается: а почему мы тогда за этот рынок так держались, почему не предвидели подобный оборот дела?

МНОГО ПРОПАГАНДЫ И ОТСУТСТВИЕ АНАЛИЗА

Не так давно по поручению А. Лукашенко экспертная группа разработала Национальную стратегию устойчивого социально-экономического развития страны до 2030 года (НСУР-2030) и представила её для публичной оценки. Прошло более месяца. Однако в официальных СМИ до сих пор нет даже попыток подобного рода. Все отмалчиваются, прекрасно понимая, что в условиях ручного управления экономикой и социальной сферой Беларуси, о чём АГ говорил не однажды, роль различных программ заключается в следующем: отвлечь внимание широкой общественности от системного анализа реального положения дел и создания видимости научного подхода к решению социально-экономических проблем.

Старшее поколение наших читателей прекрасно помнит хрущёвские эксперименты по выращиванию кукурузы чуть ли не за полярным кругом. Прожекты о том, как можно повернуть вспять сибирские реки и дать воду в засушливые районы среднеазиатских советских социалистических республик. Нынешняя модель белорусской экономики в полной мере сохранила все черты советской эпохи, одной из которых остаётся командно-административный метод управления, в основу которого кладутся не научно-обоснованные подходы, а личные амбиции и понятия высокопоставленных чиновников и их ближайшего окружения.

Мы уже рассказывали о том, что на такой основе произошла ликвидация в Краснопольском районе всех самостоятельных сельскохозяйственных предприятий и создание на этой основе одного госхоза. «Дров наломали», но виновных, по сути дела, нет. А как показывает практика, - безответственность и вседозволенность являются причиной и других бездарных и затратных по своим последствиям решений.

ФОК ИЛИ КИРПИЧНЫЙ ЗАВОД?

В том же Краснополье среди жителей сегодня ходит много разговоров вокруг приостановившегося строительства огромного, по местным меркам, здания ФОКа. Затратив около 20 млрд. средств из бюджета, строительство заморозили. Население, не стесняясь, говорит о том, что вместо этого монстра надо было бы потратить средства на возрождение в Краснопольском районе предприятия по производству красного кирпича. Когда-то эта продукция пользовалась огромным спросом у населения и промышленных предприятий Беларуси и России. Здесь работало около 120 человек - рабочих и ИТР. Сейчас именно проблема отсутствия в районе востребованных молодёжью рабочих мест делает Краснопольщину отсталым и бесперспективным регионом на востоке Могилёвщины.

Строительство ФОКа - очередной яркий пример бесхозяйственного метода ручного управления экономикой: 20 миллиардов бюджетных денег закопали в землю, но виновных нет. Как говорят в народе, *«зачем искать преступный умысел там, где налицо элементарная глупость».*

Вероника КРАСНОПОЛЬСКАЯ.

Ян Караль ХАДКЕВІЧ

455 гадоў з дня нараджэння



Ян Караль Хадкевіч (1560 - 24 верасня 1621) - вайсковы і дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага. Гетман вялікі літоўскі (1605), ваявода віленскі (1616). Прадстаўнік старажытнага магнацкага роду Хадкевічаў, што паходзіў ад кіеўскіх баяраў (XV ст.). Належаў да найстарэйшай, быхаўскай, галіны роду і ад бацькі атрымаў у спадчыну тытул графа «на Шклове, Мышы і Быхаве».

Ян Караль Хадкевіч - адзін з найбольш таленавітых вайскаводаў XVII стагоддзя. У сваёй палітычнай дзейнасці адстойваў сувэрэнітэт Вялікага Княства. У родзе Хадкевічаў існавала традыцыя актыўнага ўдзелу ў палітычным жыцці Вялікага Княства Літоўскага. Бацька Яна Караля, Ян (1537-1579), быў кашталянам віленскім (сэнатарам) і адміністратарам Інфлянтаў. У 1568 годзе ён атрымаў ад імператара Святой Рымскай імпэрыі Фердынанда тытул графа з назвамі галоўных маёнткаў - Шклова, Мышы і Быхава. Дзед вядомага вайскавода, Геранім Хадкевіч (1500-1561), быў кашталянам віленскім і ўваходзіў у склад Рады Вялікага Княства Літоўскага. А брат дзеда, Рыгор Хадкевіч, быў кашталянам віленскім і гетманам вялікім літоўскім. Гэтыя традыцыі роду, багатыя латыфундыі, галоўным чынам на Беларусі, давалі магчымасць здольнаму і амбітнаму чалавеку рабіць сваю кар'еру.

Дзяцінства Яна Караля праходзіла ў часы Інфлянцкай вайны. Ён быў сведкам ваенных дзеянняў на Літве і Балтыцы, і вельмі цікавіўся вайсковай справай. Калі хлопчыку было некалькі гадоў, бацька ўзяў яго ў паход супраць маскоўскіх войскаў Івана Жахлівага, што ўварваліся ў Літву. Пасля папярэдняй хатняй адукацыі ў 1573 годзе Ян Караль разам са сваім старэйшым братам Аляксандрам, распачаў навучанне ў Віленскай езуіцкай калегіі, а потым і ў Віленскай акадэміі. Калі кароль і вялікі князь Стэфан Баторый ў сакавіку 1579 года праязджаў праз Вільню з войскам, каб вярнуць захоплены Маскоўскім войскам Полацк, ад імя студэнтаў акадэміі яго вітаў малады Ян Караль Хадкевіч урачыстай прамовай. Ён вылучаўся сваёй здольнасцю да навукі і ўжо тады меў моцны характар. Пасля смерці бацькі атрымаў у спадчыну ня толькі маёнткі, але і тытул графа на Шклове, Мышы і Быхаве. Потым была вучоба за мяжой, дзе Ян Караль Хадкевіч, апрача акадэмічнага курсу, шмат увагі прысвячаў вайсковым ведам і тэорыі вайсковай справы.

Па вяртанні на радзіму ў 1590 годзе Ян Караль Хадкевіч зрабіўся вайскоўцам. Ужо ў 1595 годзе ён камандаваў уласнай ротай з 50 коннікаў, а потым - ротай у 100 коннікаў ва Украіне. У 1596 годзе Я. К. Хадкевіч удзельнічаў у баях з войскам Севярына Налівайкі, дзе выявіў свой вайсковы талент. За свае вайсковыя заслугі Я. К. Хадкевіч атрымаў пасаду падчашага літоўскага, а праз тры гады, у 1599 годзе, яму было нададзена Жамойцкае староства, што раўнялася ваяводзкай пасадзе, і ён увайшоў, такім чынам, у склад сенату Рэчы Паспалітай.

У 1600 годзе Ян Караль Хадкевіч на чале ўласнай коннай роты ўдзельнічаў у паходзе гетмана Яна Замойскага ў Малдову, якую заняў гаспадар Валахіі Міхай Мужны (Віцязул). Бітва войска Яна Замойскага з арміяй Міхая Мужнага адбылася ў ваколіцах Плаешці 20 кастрычніка 1600 году і скончылася перамогай Замойскага. Хадкевіч былі ў передавым атрадзе дабраахвотнікаў, якія асабліва прычыніліся да перамогі. Гетман Ян Замойскі сярод лепшых вояў вылучаў Я. К. Хадкевіча.

Падчас барацьбы ў Маскоўскай дзяржаве паміж Ілжэдзмітрыем I і Барысам Гадуновым і потым, пасля забойства Ілжэдзмітрыя I, сярод кіроўных колаў Рэчы Паспалітай папулярным быў план стварэння славянскай федэрацыі - Рэчы Паспалітай з далучэннем да яе Русі ў якасці трэцяга чальца федэрацыі. Гісторыкі сцвярджаюць, што Гетман Ян Караль Хадкевіч выступаў супраць дапамогі Ілжэдзмітрыю II і нават выказваў сваё незадавальненне каралю. Як вядома Ілжэдзмітры II паходзіў са Шклова і магчыма Ян Хадкевіч асабіста ведаў гэтага чалавека не з лепшпга боку. Каралю прыйшлося прыкласці шмат намаганняў, каб пераканаць Хадкевіча ўдзельнічаць з войскам у вайне супраць Маскоўскай дзяржавы. Урэшце Ян Караль згадзіўся на прапанову караля ўзначаліць войска для дапамогі гарнізону ў Маскве. На пачатку восені 1611 году ён сабраў у Шклове 2500 жаўнераў, запасы харчавання і амуніцыі і накіраваўся ў Маскву. Яго намаганнямі запасы харчавання былі дастаўлены ў Маскву для "апазіцыйнага" гарнізона Крамля. Але ў канцы лета - пачатку верасня 1612 году Хадкевіч быў адбіты маскоўскімі паўстанцамі. Ён спрабаваў увайсці ў горад з поўдня, прайшоўшы праз Данскі манастыр і праз Калускую браму. Яго войску ўдалося прабіцца ў Замасквар'эчча і дайсці да вуліц Вялікая Ардынка і Пятніцкая. Спробы праравацца да Крамля і Кітай-гораду не ўдаліся. Гэта вырашыла лёс крамлёўскага гарнізона. 6 снежня 1612 году гарнізон капітуляваў.

У 1618 годзе падчас новага

паходу на Маскву ў войску Яна Караля Хадкевіча налічвалася 14 тысяч чалавек, у тым ліку каля 5500 пяхоты. Войска заняло сяло Тушына на поўнач ад Масквы і пачало рыхтавацца да штурму сталіцы. На дапамогу Хадкевічу прыйшло з Украіны 20-тысячнае казацкае войска на чале з гетманам Пятром Канашэвічам-Сагайдачным. Пачаўся новы штурм Масквы праз Цвярскую і Арбацкую брамы, але ён быў адбіты. У выніку перамоваў 11 снежня 1618 году ў сяле Дэўліне (каля Тройца-Сергіева манастыра) было падпісанае перамір'е. Расея адмовілася ад прэтэнзіяў на смаленскую, чарнігаўскаю і северскую землі, якія цяпер вярталіся ў склад Вялікага Княства Літоўскага.

А ў хуткасці пачалася вайна супраць Турцыі і крымскіх татараў. Ян Хадкевіч зноў узначаліў галоўнае камандаванне над узброенымі сіламі Рэчы Паспалітай. Аднак гады, праведзеныя на войнах, паўплывалі на яго здароўе. Я. К. Хадкевіч усё часцей хварэў. Памёр Ян Хадкевіч 24 верасня 1621 года. Хоць камандзіры спрабавалі захаваць гэтую вестку ў таямніцы, каб не аслабіць баявы дух жаўнераў, ягонае войска хутка даведалася і, калі перавозілі ў замак Хоцін яго цела, жанеры сталі ў строй і аддалі вайсковае шанаванне свайму палкаводцу. У хуткасці вайна закончылася перамогай. Султан забараніў крымскім татарам нападаць на Украіну.

Цела Хадкевіча была дастаўлена ў Камянец-Падольскі, дзе ён быў пахаваны 14 кастрычніка 1621 году. Летам 1622 году, удава Хадкевіча дамаглася экзгумацыі, і Хадкевіч быў перапахаваны ў рэзыдэнцыі князёў Астроскіх - горадзе Астрогу на Валыні ў чэрвені таго ж году. Труна была эвакуявана з Астрогу падчас паўстання Хмяльніцкага ў 1648 годзе, і вернутае туды зноў у 1654 годзе. Яшчэ раз рэшткі Хадкевіча былі перапахаваныя ў новую магілу ў Астрогу ў 1722 годзе.

У Яна Караля Хадкевіча засталася спадчына. У тым ліку горад Шклоў і Шклоўскае графства. Праўда, застаіся і даўгі, якія дасягалі 100 тысяч злотых. Патрыёт сваёй дзяржавы, Ян Караль Хадкевіч ахвярна пералічаў асабістыя грошы на войска і да апошняга моманту бараніў сваю Айчыну.

Нажаль, сёння імя Яна Хадкевіча адсутнічае ў тапаніміцы горада Шклова. Пра тагачасныя падзеі не паглядзім і кінафільм па нацыянальнаму каналу. Між тым, добра было б, каб беларускія байкеры пад старажытнымі сцягамі таго часу здзейснілі вандроўку у Маскву і праехалі тымі ж мясцінамі, дзе некалі праходзілі беларускія ваяры пад кіраўніцтвам Яна Караля Хадкевіча.

Аляксандр ГРУДЗІНА,
краязнаўца.

АДУСЮЛЬ ПАКРЫХУ

У цэнтры Магілёва прадаюць маёмасць аднаго з найбуйнейшых прадпрыемстваў горада - ААТ "Магілёўскі завод "Строммашына". На публічныя таргі выставілі будынак заводакіраўніцтва на вуліцы Першамайскай. На "Строммашына" паведамілі, што будынак быў у закладзе. Пасля таго як грошы па залогу не выплацілі, маёмасць арыштавалі і выставілі на таргі. Супрацоўнікаў перавядуць у іншы будынак на тэрыторыі завода. Прапанову прадаць нерухомую маёмасць завода і вырашыць частку эканамічных праблем прадпрыемству не раз прапаноўвала кіраўніцтва горада. Ці ледзь не на кожнай аператыўнай нарадзе ў гарвыканкаме ўздымалася пытанне аб запазычанасці па зарплаце на "Строммашына" - яна на прадпрыемстве ўсё яшчэ не выплачана ў поўным аб'ёме нават за люты.

Палата прадстаўнікоў прыняла ў другім чытанні папраўкі ў закон "Аб дзяржаўных сімвалах Рэспублікі Беларусь". Замацоўваецца патрабаванне аб абавязковым выкананні Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь ва ўстановах адукацыі ў дні пачатку і заканчэння навучальнага года. Акрамя таго, дакумент удакладняе пералік месцаў, дзе падымаецца або усталёўваецца Дзяржаўны сцяг Беларусі, а таксама размяшчаецца герб.

З Магілёўскага аэрапорта 13 чэрвеня адправіўся першы пасажырскі рэйс кампаніі «Белавія» Магілёў - Бургас (Балгарыя). Чартарныя рэйсы з Магілёва вырашылі аднавіць пасля 18-гадовага перапынку. Пералёты ў Бургас будуць ажыццяўляцца ў чэрвені, ліпені, жніўні і верасні. Усяго запланавана адправіць дзевяць рэйсаў. Апошні вылет будзе 5 верасня. Авіярэйсы будуць выконвацца пасажырскім самалётам Boeing 737. Калі будзе попыт, то з нашага аэрадрома будуць ажыццяўляцца пасажырскія рэйсы ў Турцыю, Егіпет, Грэцыю і г.д.

Са студзеня па красавік 2015 г. замежныя грамадзяне з 25 краін скарысталіся медыцынскімі паслугамі, якія прадстаўляюцца арганізацыямі аховы здароўя Магілёўскай вобласці. За чатыры месяцы агульная сума падобных паслуг склала $ 235,6 тысячы.

Жыхары Магілёўскай вобласці, якія не могуць разлічыцца з банкамі па валютных крэдытах, трапляюць пад незвычайныя санкцыі. У апошні час у дачыненні да даўжнікоў - фізічных асоб актыўна сталі выкарыстоўваць яшчэ і такія меры, як забарона на выезд за межы Рэспублікі Беларусь і часовае пазбаўленне права кіравання аўтамабілем і нават маламернымі судамі, такімі, як яхты. Але ў першую чаргу імем закона арыштоўваюць маёмасць даўжнікоў - дачы, кватэры і машыны.

Падрыхтаваў Міхась БАРАЗНА.

Магілёўскі ВЫБАР

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Адрас рэдакцыі: 213155, Магілёўская вобласць, Магілёўскі раён, в.Брылі, вул.Юбілейная, 6-7. Тэл. 8-0222-710451
E-mail: mikolabryl@gmail.com. Выдавец Яцкова Ала Міхайлаўна. Наклад 299 асобнікаў. Фармат А-4. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Падпісана ў друк 16.06.2015 г. у 10.00.